Текст
для вступительных испытаний в кадетское училище
по учебному предмету «Белорусский язык»

**Дыктант**

Музейная гара

Самы высокі бераг Нёмана ў Гродне здаўна называюць Замкавай гарой. На гэтым старажытным узвышшы знаходзяцца два музеі – Стары і Новы замкі.

Стары замак быў і абарончай крэпасцю, і палацам, і рэзідэнцыяй вялікага князя Вітаўта. Замак будаваўся і перабудоўваўся, быў драўляны і каменным. Цяпер у музейных залах можна ўбачыць прылады працы, якімі гарадзенцы карысталіся восемсот гадоў назад: сярпы, нажы, нажніцы, іголкі.

У Новым замку нельга прапусціць залу са зброяй мінулых вякоў. Тут можна нават сфатаграфавацца з воінам у рыцарскіх даспехах, убачыць грамату, якую паднялі з дна Нёмана.

Правільна казалі нашы мудрыя продкі: ”З рамяством дружыць – у жыцці не тужыць“. Справа іх умелых рук жыве, натхняе, выхоўвае. (110 слоў)

Паводле У.Ліпскага